УДК 811.161.3

Д. В. Дзятко, дац., канд. філал. навук
(БДПУ імя Максіма Танка, г. Мінск)

# СТАТУС І СТРУКТУРА МЕТАЛЕКСІКАГРАФІІ Ў ЗАМЕЖНАЙ ЛІНГВІСТЫЦЫ

У канцы XX ст. асобныя мовазнаўцы адзначалі, што ў сістэме лінгвістычных дысцыплін вылучылася галіна, якая займаецца тэарэтычным аспектам лексікаграфічнага апісання [1, с. 133], – "лексікаграфія, якая ўзаемадзейнічае з лексікаграфіяй" [5, с. 1–2].

У апошнія дзесяцігоддзі акрэслілася тэндэнцыя да аўтанамізацыі гэтага і некаторых іншых напрамкаў лексікаграфіі. Паводле *P. Żmigrodzki*, лексікаграфія аб'ядноўвае тэхнічныя і тэарэтычныя аспекты і абапіраецца на дадзеныя розных лінгвістычных дысцыплін (лексічнай семантыкі, лексічнай статыстыкі, арфаграфіі, граматыкі і інш.) [6, с. 24]. У сваю чаргу, металексікаграфія − дысцыпліна, якая звязана з тэорыяй і метадалогіяй лексікаграфічнага апісання, распрацоўкай класіфікацыі слоўнікаў розных тыпаў і іх характарыстыкай, а таксама з вывучэннем самой структуры лексікаграфіі [7, с. 16].

Такім чынам, ***металексікаграфія*** – раздзел лексікаграфіі, які ўключае тэарэтычнае вывучэнне лексікаграфіі як слоўнікавай дзейнасці. У сферу яе інтарэсаў уваходзяць: 1) асэнсаванне сутнасці, зместу, задач, структуры, прадмета і аб'екта лексікаграфіі; 2) высвятленне метадаў, методык і прынцыпаў лексікаграфічнага апісання моўнай сістэмы; 3) выпрацоўка асноў лексікаграфавання моўнага матэрыялу (стварэнне праграм, кіраўніцтваў па выкарыстанні і інш.); 4) акрэсленне ўнутранай сістэмы і структуры слоўніка ў залежнасці ад яго мэты, тыпу і жанру; 5) даследаванне функцый слоўніка; 6) вывучэнне гісторыя лексікаграфіі.

У адпаведнасці з меркаваннем, сфармуляваным аўтарамі "Manual of Specialised Lexicography", металексікаграфія ўключае ў сябе тры асноўныя падраздзелы: 1) даследаванне функцыянальных характарыстык ("*user research*") – стварэнне тэорыі, распрацоўка метадаў ацэнкі выкарыстання слоўнікаў, павышэнне эфектыўнасці лексікаграфічных прадуктаў (напр., за кошт кіраўніцтваў для карыстальнікаў); б) крытыка слоўнікаў – напісанне рэцэнзій на слоўнікі, абгрунтаванне агульных прынцыпаў ацэнкі існуючых слоўнікаў (г. зн. вывучаюцца толькі ўжо створаныя лексікаграфічныя прадукты); в) т. зв. "сістэматычныя слоўнікавыя даследаванні" – фармуляванне новых або ўдасканаленне існуючых тэорый з мэтай іх выкарыстання пры распрацоўцы лексікаграфічных праектаў. Апошні падраздзел уключае таксама

гістарыяграфічныя даследаванні слоўнікаў для інвентарызацыі больш ранніх лексікаграфічных тэорый і іх адаптацыі да новых умоў [3, с. 30–31].

Паводле *F. J. Hausmann*, монамоўная і двухмоўная металексікаграфія ўключае ў сябе пяць асноўных кірункаў: 1) лексікаграфічная тэорыя; 2) слоўнікавая крытыка; 3) даследаванне выкарыстання слоўніка; 4) даследаванне статусу слоўніка і маркетынг; 5) гісторыя лексікаграфіі. Тэорыя лексікаграфіі, у сваю чаргу, падзяляецца на: а) тэкставую тэорыю лексікаграфічных тэкстаў; б) слоўнікавую тыпалогію; в) збор і апрацоўку дадзеных (у тым ліку з выкарыстаннем камп'ютарных рэсурсаў); г) тэорыю арганізацыі слоўнікавай працы; д) тэорыю аб мэтах слоўніка [2].

Падыход *K. Miyoshi* карэлюе з поглядамі *F. J. Hausmann* і *Manual of Specialised Lexicography* і, верагодна, часткова на іх грунтуецца. У адпаведнасці з ім развіццё сучаснай металексікаграфіі адбываецца ў шасці асноўных кірунках: 1) вывучэнне лексікаграфічнай традыцыі (слоўнікавая гісторыя); 2) класіфікацыя лексікаграфічных жанраў (слоўнікавая тыпалогія); 3) даследаванне складовых частак слоўнікаў (структура слоўніка); 4) ацэнка якасці слоўнікаў (слоўнікавая крытыка); 5) аналіз выкарыстання слоўніка; 6) вывучэнне магчымасцей камп'ютарнай падтрымкі (інфармацыйныя тэхналогіі ў лексікаграфіі) [4, с. XI].

Такім чынам, можна сцвярджаць, што металексікаграфія як навуковая дысцыпліна ў цэлым сфарміравала сваю структуру, найважнейшымі яе кампанентамі з'яўляюцца: тэорыя лексікаграфіі, гісторыя лексікаграфіі, тыпалогія слоўнікаў, выпрацоўка аптымальнай структуры слоўнікаў розных тыпаў. Ускосна паказчыкам сфарміраванасці металексікаграфіі з'яўляецца магчымасць далейшага развіцця асобных яе раздзелаў, напрыклад, метатэрмінаграфіі, метафразеаграфіі, метаафарграфіі і інш.

ЛІТАРАТУРА

1. Burkhanov, I. Lexicography: A Dictionary of Basic Terminology / I. Burkhanov. – Rzeszówie : Wyd-wo Wyższej Szkoły Pedagogicznej, 1998. – 285 p.

2. Hausmann, F. J. The Training and Professional Development of Lexicographers in Germany / F. J. Hausmann // Lexicography: An emerging international profession / ed. R. F. Ilson. – Manchester : University Press, 1986. – P. 101–110.

3. Manual of Specialised Lexicography / eds.: H. Bergenholtz, S. Tarp. – Amsterdam – Philadelphia: John Benjamins Publishing Company, 1995. – 256 p.

4. Miyoshi, K. The First Century of English Monolingua / K. Miyoshi. – Cambridge : Cambridge Scholars Publishing, 2017. – 180 s.
5. Svensén, B. Practical Lexicography / B. Svensén. – New York : Oxford University Press, 1993. – 285 p.
6. Żmigrodzki, P. Słowo − słownik − rzeczywistość / P. Żmigrodzki. − Kraków : Lexis, 2008. − 230 s.
7. Żmigrodzki, P. Wprowadzenie do leksykografii polskiej / P. Żmigrodzki. − Kraków : Wyd-wo Uniwersitetu Śląskiego, 2003. − 269 s.

811.161.3’367.633 + 811.161.3’366.54

К.Д. Ганчарэнка, ст. навук. супрац., канд. філал. навук
(Цэнтр даследаванняў беларускай культуры,
мовы і літаратуры НАН Беларусі, г. Мінск)

## УЖЫВАННЕ КАНСТРУКЦЫЙ З ПРЫНАЗОЎНІКАМІ *АБ/ ПРА* Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ XXI ст.

У сучаснай практыцы ідзе паступовае адмаўленне ад выкарыстання канструкцыі *аб* + назоўнік з М. скл. пры абазначэнні аб’екта пачуццяў, тэмы гутаркі і яе замена на *пра* + В. скл. Варыятнасць ёсць і ў займеніках: *аб ёй/ пра яе*, *аб гэтым/ пра гэта*.
У першую чаргу змены датычацца асабовых назоўнікаў м. р. Так, спалучэнне *пра мужа* зафіксавана ў інтэрнэт-дыскурсе за 2010–2018 гг. больш за 80%, *аб мужу* – на даведачных, рэгіянальных сайтах і інш. *Адразу скажуць, жонка піша* ***пра мужа***. (zviazda.by, 25.02.2016). Адна з прычын пераходу да канструкцый з *пра* – больш складаная сістэма канчаткаў М. скл. у параўнанні з В. скл. У М. скл. у асабовых назоўнікаў м. р. з мяккай асновай, на *р, ц* і шыпячыя – розныя канчаткі з неасабовым назоўнікамі: *аб вучн**ю**/ кан**і***, *аб Мележ**у**/ Парыж**ы***. У школьных падручніках асноўным канчаткам для асабовых назоўнікаў м. р. з цвёрдай асновай быў *-у* (М.Ц. Кавалёва, 1991, 1995, Г.А. Гваздовіч і інш., 1999, 2004), *-е* як варыянтны: *аб сыну(-е)*. У апошнім падручніку (Г. М. Валочка і інш., 2016) асноўным стаў *-е*: *аб сыне, Коласе*. Форма з прыназоўнікам *пра* і В. скл., які мае канчаткі *-а* (*-я*), а з неадушаўлёнымі назоўнікамі – форму Н. скл. – больш аптымальная. *Ён унуку* ***пра Аляксандра*** *Македонскага чытаў* (Бярозка. № 2. 2018), *пра хлопца, пра мядведзя-выратавальніка, пра інцыдэнт*. Форма *пра* зручная і для назоўнікаў ж. р. на *г, к, х,* дзе ў М. скл. адбываецца змяненне ў аснове: ***Аб бяспецы*** *гаворым бесперапынна…* (minobl.mchs.gov.by, 31.10.2018) і *З малымі* ***пра бяспеку****!* (mogilev.mchs.gov.by, 24.01.2019).